Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся.

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 33 (378) | Субота, 24 кастрычніка, 1959 года. | Цана 10 кап.

## БРАВА, ГЕОГРАФЫ!

Фотарэпартаж



Здымак 1.

*У КОЖНАЙ прафесіі ёсць свая характэрная вопратка. Я не ведаю, ці ёсць такая прафесія «студэнт на ўборцы бульбы», але калі вы сустрэнеце ў сельскай мясцовасці некалькі чалавек у ватніках і рознакаляровых, шараварах, пачынаючы з нябесна блакітнага і канчаючы малінавым, то яны, напэўна, будуць студэнтамі на ўборцы бульбы. Гэтыя малінавыя шаравары вельмі дапамогуць вам адрозніць іх ад калгаснікаў, якія аддаюць перавагу больш строгім афарбоўкам. Ва ўсім жа астатнім, калі студэнт становіцца калгаснікам, то ён Калгаснік з вялікай літары.*

*Уборка бульбы—гэта перыяд, які зблiжае першакурснікаў і робіць іх калектывам, перыяд, які дае студэнтам старшых курсаў матэрыял для расказаў на цэлы год: «А памятаеш, як мы!..», перыяд, калі «хвараюць» усе гультаі і катастрафічна павялічваецца колькасць наведвальнікаў паліклінік.*

*Наогул, уборка бульбы—гэта слаўная старонка ў студэнцкім жыцці.*

*Тэрыторыя калгаса Ільіча Мінскага раёна нагадвае сабой сумную, з невялікімі ўзгоркамі, раўніну карычневага колеру з беднай раслиннасцю. Але што сапраўды радуе вока на ёй, дык гэта тое, што ўсё ўбрана.*



Здымак 2.



Здымак 3.

*Апошняе з'яўляецца заслугай студэнтаў геафака. Яны змаглі зрабіць усё на тры дні раней тэрміну.*

*Гэтыя здымкі зроблены ў калгасе імя Ільіча, дзе працаваў чацвёрты курс геафака.*

*1.—Выдатны ураджай у гэтым годзе!—гаворыць лабарант кафедры эканамічнай геаграфіі Віктар Фёдаравіч Клімаў, адказны за курс.*

*2. — Шкада, што гэтага каня нельга ўзяць у Мінск!—гаворыць Клава Дзерах.*

*3. Рабочы момант. На пярэднім плане—Тоня Панкратава.*

*4. Апошнюю бручку выцягвалі, як рэпку ў казцы.*

*А. ЛУКАШОЎ*



Здымак 4.

*Камсамольцы і камсамолкі, савецкая моладзь! Вучыцеся жыць і працаваць па-камуністычнаму! Выпрацоўвайце ў сабе высокія маральныя якасці! Будзьце свядомымі і нястомнымі будаўнікамі камунізма!*

**(З Заклікаў ЦК КПСС да 42-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.)**

## ПРАЦАВАЛІ МЫ ДРУЖНА

РАНІЦА выдалася пахмурная, але настрой ва ўсіх сабраўшыхся ля інтэрната студэнтаў другога і трэцяга курсаў юрфака быў прыўзняты. Яшчэ б, каму не ахвота пасля больш чым месяца вучобы па-сапраўднаму фізічна папрацаваць і пасля прыемнай стомленасці з апетытам паабедаць, усведамляючы, што праца твая патрэбна людзям, Радзіме. У гадзін 10 раніцы выехалі на грузавых аўтамашынах, а праз якіх з паўгадзіны мы былі ўжо на месцы—у трэцім аддзяленні саўгаса «Рассвет». Яшчэ ў дарозе студэнты звярнулі ўвагу, што аколіцы вёсак Вялікі Трасцянец і Малы Трасцянец багаты помнікамі Вялікай Айчыннай вайны (дарэчы, тут у гады вайны размяшчаўся лагер смерці, у якім былі закатаваны дзесяткі тысяч савецкіх грамадзян). Але самае галоўнае, у чым мы пераканаліся гадзін за некалькі пасля прыезду, у гэтых вёсках жывуць працавітыя, гасцінныя людзі. Па 2—4 чалавекі ўладкаваліся на кватэры, і пасля невялікага адпачынку выйшлі ў поле. Аднак першы дзень (дакладней, палавіна дня) работа не зусім ладзілася. Але на наступны дзень пайшла больш спорна.

І адразу ж вылучыліся дзве групы: у адных студэнтаў работа ішла больш хуткімі тэмпамі. Выкладчык Сяргей Пятровіч Бякешка, параіўшыся са студэнтамі, для таго, каб ліквідаваць абязлічку ў аплаце працы, рашыў фармальна вылучыць «перадавікоў» у асобную брыгаду на чале з Анатолем Галасуем. І групе далі больш павышаныя дзённыя нормы. Першыя дні яе паказчыкі былі значна большымі, чым у «адстаючай» брыгады, якую ўзначальваў Пётр Шахновіч. Лепш іншых працавалі Ніна Зіневіч, Леакадзія Корзун, Жана Дзіброва, Павел Герасімчык, Аляксандр Валевіч і інш. Аднак праз тры дні хлопцы і дзяўчаты брыгады Шахновіча паказалі такія тэмпы, што зараз цяжка сказаць, якая з груп ідзе ўперадзе. Адно бяспрэчна—усе працуюць сумленна.

...На бульбяным полі чуецца раўнамерны рокат трактара. Ён некалькі хвілін пыхціць на месцы, пакуль паднасяць да прычэпленай ззаду скрыні выкапаную бульбу, а затым павольна пад'язджае ўперад. Калі ж трактарыст адлучаецца ад трактара, тады яго месца займае студэнт трэцяга курса юрфака Васіль Кулага. І хоць у Васі правы шафёра, а не трактарыста ды і ватоўка не такая зашмальцаваная, як у трактарыста саўгаса Анатоля Кеда, ён адчувае сябе за рулём упэўнена.

А вось уперадзе пачуўся звонкі тэнар Уладзіміра Каклюхіна:

У каждой работы
Имеется срок...

Закончыўшы сваю баразну, ён ідзе на дапамогу Лёве Садоўскаму. І так робіць кожны. Дружба, узаемадапамога і настойлівасць далі магчымасць студэнтам паспяхова весці ўборку бульбы.

**Л. СЯНЮТА.**

**Саўгас «Рассвет», Мінскі раён.**

## У НАС У ГАСЦЯХ АРТЫСТЫ.

Днямі ў клубе БДУ адбылася цікавая сустрэча студэнтаў універсітэта з дзеячамі украінскага кінамастацтва. Перад сабраўшыміся выступілі рэжысёр кінафільма «Салдатка» П. Дзянісенка і рэжысёр кінафільма «Неба кліча» М. Карукоў. Цёпла было ўспрынята выступленне рэжысёра кінафільма «Смага» Я. Ташкова.

## НАРАДА ПА ЛЮМІНЕСЦЭНЦЫІ

У актавай зале і прасторных аўдыторыях гуманітарнага корпуса нашага універсітэта ўстаноўлены складаныя прыборы. Часта выключаецца свет, і на экране з'яўляюцца дакладныя чарцяжы, графікі і схемы. Прысутныя з увагай і нейкай крытычнай цікавасцю слухаюць дакладчыка — ідзе ўсесаюзная нарада па люмінесцэнцыі.

У нарадзе па люмінесцэнцыі прымаюць удзел прадстаўнікі Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Алма-Аты, Свярдлоўска, Харкава, Чыты і раду іншых гарадоў—усяго больш як 300 чалавек. На парадку дня нарады 108 дакладаў, якія зрабілі віднейшыя вучоныя-фізікі краіны. 24 даклады прачыталі беларускія вучоныя, у тым ліку і выкладчыкі нашага універсітэта. Грунтоўныя даследаванні ў вобласці люмінесцэнцыі—з'явы «высвечвання» рэчывам паглынаемай энергіі—зрабілі прафесары А. Н. Сеўчанка, Ц. М. Годнеў, М. А. Ельяшэвіч, Б. І. Сцяпанаў і іншыя.

Сёння нарада заканчвае сваю работу.

**В. КАПЦІЛОВІЧ.**

## ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

Год назад па загаду Міністра вышэйшай адукацыі СССР фізіка-матэматычны факультэт нашага універсітэта быў падзелен на два факультэты: фізічны і матэматычны.

Падзел быў выклікан значным ростам факультэта. У момант падзелу на фізіка-матэматычным факультэце навучалася звыш 1.200 студэнтаў (разам з завочнікамі). На факультэце працавала 11 кафедраў. Абодва факультэты пасля падзелу пачынаюць няўхільна расці. Цяпер на матэматычным факультэце навучаецца каля 800 студэнтаў.

У мінулым навучальным годзе факультэт выпусціў сто дваццаць спецыялістаў. У гэтым навучальным годзе матфак пераходзіць на работу па новых вучэбных планах, складзеных у сувязі з перабудовай вышэйшай школы. На першых двух курсах работа вядзецца ў адпаведнасці з новымі вучэбнымі планамі, а астатнія курсы факультэта працуюць па пераходных планах.

Пасля падзелу факультэтаў, матэматыкі не парвалі сяброўскіх дзелавых адносін з фізікамі. Хочацца выказаць глыбокую ўдзячнасць дэкану фізічнага факультэта Міхаілу Панцялеевічу Халімановічу за каштоўную дапамогу, аказаную нашаму вылічальнаму цэнтру.

**Прафесар Д. А. СУПРУПЕНКА, дэкан матэматычнага факультэта.**

**(Газета «Решим любую задачу!».)**



**ДЗЯКУЮЧЫ** самаадданай працы рабочых, усё вышэй растуць сцены галоўнага корпуса універсітэта. Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 42-й гадавіны Вялікага Кастрычніка, калектыў 1-га ўчастка УНР-7 узяў на сябе абавязацельства выканаць месячны план да 28 кастрычніка. З «аганьком» працуе ў гэтыя дні электразваршчык Уладзімір Камароў.

**Фота А. ГАРЭЗНАГА.**

# МІЖНАРОДНЫ СТУДЭНЦКІ...

**У апошні час добрай градыцыяй сталі сустрэчы, дыскусіі і міжнародныя семінары студэнтаў розных краін свету. Нядаўна ў Маскве закончыўся міжнародны студэнцкі семінар на тэму «Вышэйшая адукацыя ў СССР». У ім удзельнічалі прадстаўнікі студэнцкіх арганізацый з 42 краін. Ніжэй мы друкуем артыкул удзельніка семінара, аспіранта нашага універсітэта Я. Бабосава.**

● ● ●

ТЭМА СЕМІНАРА выклікана велізарнай цікавасцю зарубежнай моладзі да савецкай вышэйшай школы, да яе выдатных дасягненняў. Перад удзельнікамі выступаў з дакладам намеснік Міністра вышэйшай адукацыі СССР Пракоф'еў. Велізарную цікавасць выклікалі сустрэчы з прэзідэнтам Акадэміі навук СССР акадэмікам Несмяянавым, рэктарам Маскоўскага універсітэта акадэмікам Пятроўскім.

Удзельнікі семінара падрабязна азнаёміліся з арганізацыяй вучэбнага працэсу і жыццём студэнтаў Маскоўскага універсітэта, энергетычнага, медыцынскага, педагагічнага інстытутаў, пабывалі ў бібліятэках, лабараторыях, спартзалах, клубах, студэнцкіх інтэрнатах.

«Поспехі СССР ва ўмацаванні сувязі вышэйшай школы з жыццём прынясуць асабліва вялікую карысць каланіяльным народам і народам, нядаўна заваяваўшым незалежнасць,—гаварыў ліванец Ахмед Найя.—Раней прафесары задавальняліся тым, што студэнт ведаў змест сваёй кнігі па латыні і нават задам наперад. Цяпер мы выдатна разумеем, што абмяжоўваць студэнта толькі чытаннем кнігі—гэта азначае, надзець на яго шоры, адарваць ад жыцця народа. Гэта задавальняе імперыялістаў, каланізатараў, але не можа задаволіць нас».

У сваіх выступленнях, у гутарках з савецкімі студэнтамі юнакі і дзяўчаты іншых краін падкрэслівалі велізарныя поспехі савецкай вышэйшай школы, выхаванікі якой з'явіліся стваральнікамі першага штучнага спадарожніка Зямлі і першай штучнай планеты сонечнай сістэмы, упершыню ажыццявілі палёт ракеты на другое нябеснае цела—Месяц. Паведамленне аб гэтым навуковым подзвігу, атрыманае у дні работы семінара, было сустрэта з вялікім задавальненнем і гордасцю за чалавечы розум.

Упаўне зразумелы і звычайны той інтарэс, з якім удзельнікі семінара аглядалі на наступны дзень касмічную лабараторыю і астанамічную абсерваторыю універсітэта. У цэнтры усіх размоў, усіх пытанняў да супрацоўнікаў лабараторыі і абсерваторыі быў своеасаблівы трохкутнік: Зямля—савецкая ракета—Месяц.

Пасля агляду лабараторый студэнтка фізіка-матэматычнага факультэта універсітэта Буэнос-Айрэса Марта Росен сказала з хваляваннем: «У вашай краіне выдатныя ўмовы навучання і жыцця студэнтаў. Ім не трэба думаць аб кавалку хлеба, аб рабоце ў будучым; аб усім гэтым клапоціцца дзяржава. У нас, у Аргентыне, многія студэнты вымушаны працаваць па 8 гадзін у дзень, каб мець сродкі для жыцця».

Найбольш ажыўленымі і пастудэнцку шумнымі былі пасяджэнні, на якіх праходзіла дыскусія на тэму «Універсітэт і грамадства».

Не мелі поспеху спробы старшынствуючага ў гэты дзень Клауса Мешката—былога прэзідэнта Саюза нямецкіх студэнтаў з ФРГ, і віцэ-прэзідэнта нацыянальнага Саюза студэнтаў Англіі Дэвіда Уайта накіраваць дыскусію у спакойнае рэчышча размоў аб універсітэцкай аўтаноміі і праблемах, якія датычаць студэнтаў «як такіх». Адразу ж пасля таго, як Мешкат сфармуляваў свае «пяць пунктаў», у рамках якіх ён меў намер правесці дыскусію, слова ўзяў старшыня саюза студэнтаў-мусульман Алжыра Рыдха Малек.

—Мы згодны весці дыскусію аб ролі універсітэта ў грамадстве,—сказаў ён,—але пяць пунктаў, прапанаваных старшынёй, з'яўляюцца вельмі вузкімі. Яны маюць на ўвазе перашкодзіць студэнцтву змагацца супраць каланіялізма, імперыялізма і пагрозы вайны. Мы можам абмяркоўваць праблему універсітэта толькі ў сувязі з праблемай каланіялізма. Універсітэт у Алжыры—гэта інструмент каланіяльнага прыгнёту і эксплуатацыі. У ім навучаецца толькі 600 алжырцаў—вельмі невялікая лічба ў параўнанні з 7 тысячамі французскіх студэнтаў гэтага універсітэта. Таму мы адвяргаем канцэпцыю «студэнтаў як такіх».

Гэтае выступленне знайшло гарачую падтрымку прадстаўнікоў студэнтаў Ірана, Туніса, Іарданіі, Марока, Калумбіі, Бразіліі, Пакістана і іншых краін.

—Нас хвалюе не універсітэцкая аўтаномія,—заявіў прадстаўнік Федэрацыі студэнтаў Чорнай Афрыкі, якія навучаюцца ў Францыі, Осман Камара.—Для нас галоўнае пытанне—само існаванне нацыянальнай вышэйшай школы. 90 працэнтаў дзяцей школьнага ўзросту ў нашых краінах не ведаюць, што такое школа. Яны жывуць ў голадзе і галечы. Дадайце да гэтага, што наша моладзь атрымлівае выхаванне, якое даюць амерыканскія кінафільмы, і вы зразумееце, што яна знаходзіцца у трагічным становішчы. Выйсце з яго адзінае—барацьба за нацыянальнае вызваленне.

Пераважаючая большасць удзельнікаў дыскусіі выказалася ў тым духу, што вышэйшая школа павінна не толькі рыхтаваць спецыялістаў, але і выхоўваць актыўных грамадзян. Хіба ж можа студэнт стаяць у баку ад бурных падзей нашай эпохі, эпохі атамнай энергіі, эпохі рэвалюцыйных рухаў і барацьбы супраць імперыялізма і каланіялізма,—за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне народаў, за светлае будучае чалавецтва. Зразумела, не! Як мага бліжэй да вытворчай дзейнасці, да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці—вось што павінна заняць цэнтральнае месца у коле інтарэсаў студэнцтва. Так гаварылі прадстаўнікі студэнцкай моладзі Кітайскай Народнай Рэспублікі, Чэхаславакіі, Балгарыі, Ірака, Туніса і іншых краін.

З велізарнай цікавасцю пасланцы студэнтаў Еўропы і Афрыкі, Амерыкі і Азіі слухалі расказы прадстаўнікоў Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Тбілісі аб актыўным удзеле савецкіх студэнтаў у грамадскім жыцці, аб працоўным выхаванні моладзі.

У сваю чаргу студэнты краін Лацінскай Амерыкі расказалі аб тым, што большасць студэнцкіх арганізацый гэтых краін выступае супраць канцэпцыі «студэнтаў як такіх» і прымае актыўны удзел у жыцці грамадства.

«Мы,—гаворыць Марсіо Гургель до Амарал, студэнт універсітэта з Сан-Паула,—бачым сваю галоўную задачу ў тым, каб разам з усім народам вырваць школу Бразіліі з рук залежнай ад імперыялістаў ЗША фінансавай алігархіі і забяспечыць яе сродкамі існавання, каб ператварыць нашы універсітэты ў сродак адукацыі народа і сацыяльнага пераўтварэння у нашай краіне».

Хасэ Радрыгес—студэнт Гаванскага універсітэта сказаў, што студэнцкі рух Кубы цесна звязаны з рухам народа за ўмацаванне рэспублікі.

Калі я папрасіў яго больш падрабязна расказаць аб удзеле кубінскіх студэнтаў у рэвалюцыйным руху, Хасэ, які тры гады знаходзіўся ў падполлі, сказаў, што ў барацьбе супраць дыктатарскага рэжыму Бацісты асноўную ролю адыйграла моладзь, якая склала ядро паўстанцкай арміі. Студэнты займалі кіруючыя пасады ў арміі, у групах грамадзянскага супраціўлення.

У сваю чаргу Хасэ зацікавіўся жыццём беларускіх студэнтаў, многа распытваў аб Мінску, аб партызанскім руху ў Беларусі. Асабліва моцнае ўражанне зрабіла на яго апавяданне аб баявой дзейнасці выпускніка Беларускага універсітэта, праслаўленага партызана-падрыўніка, Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Парахневіча.

Гарачая дыскусія праходзіла не толькі у зале пасяджэнняў семінара, але і ў перапынках, у пакоях, дзе пражывалі яго ўдзельнікі. І хоць па асобных пытаннях яны выказвалі розныя думкі, усе заўсёды сходзіліся ў адным—самае галоўнае для моладзі—гэта мір і дружба.

«Студэнты маленькага Кіпра таксама любяць мір, як і студэнты вялікага Савецкага Саюза,—гаворыць старшыня Саюза студэнтаў-кіпрыётаў Хрыстафініс Доніс. Яны змагаюцца за тое, каб Кіпр не быў выкарыстан імперыялістамі, як база для нападу на міралюбівае чалавецтва».

І ўсе удзельнікі семінара згадзіліся са словамі аспіранта МДУ Уладлена Іванова, што значна лепш сядзець за студэнцкім сталом, чым ляжаць адзін супраць другога ў акопах.

Сяброўская атмасфера семінара, шчыры абмен думкамі садзейнічалі умацаванню ўзаемаразумення і расшырэнню сувязей паміж студэнтамі розных краін. Таму міжнародны студэнцкі семінар у Маскве, як адзначаецца ў камюніке, «унёс пэўны ўклад у працэс аздараўлення міжнароднай абстаноўкі».

## КОРАТКА

**⊙ Адбылося ўшанаванне загадчыка кафедры беларускай мовы заслужанага дзеяча навукі БССР дацэнта М. І. Жыркевіча з выпадку 60-годдзя з дня яго нараджэння. З віншавальнымі прамовамі выступілі выкладчыкі і студэнты. Юбіляру былі ўручаны падарункі і жывыя кветкі.**

**⊙ Нядаўна адбылося адкрытае пасяджэнне кафедраў нямецкай і французскай моў. На ім прысутнічалі першакурснікі, для якіх выкладчыца Р. П. Варагніцкая прачытала даклад на тэму «Самастойная работа студэнтаў над замежнай мовай».**

**⊙ Для студэнтаў першага курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта дацэнт М. П. Бараноўская прачытала лекцыю аб гісторыі нашага універсітэта. Лекцыя была вельмі цікавай і з увагай праслухана першакурснікамі.**

**К. ВЕЧАСЛАВІЧ.**

## «СЧАСТЛИВАЯ ПОРА...»





● ●

**«Счастливая пора, очей очарованье...».**

**Бадай што, гэтыя паэтызуючыя восень цудоўныя пушкінскія радкі ведае кожны. Не толькі паэтаў—вабіла восень ва ўсе часы і мастакоў, і музыкантаў. У нас, ва універстэце, мастакоў, і музыкантаў, якія б малявалі асеннія пейзажы, якім бы яна навявала свае, восеньскія, матывы, здаецца, няма. Але хіба можа прайсці раўнадушна міма прыгажосцей залатой восені любы фатограф, няхай ён прафесіянал ці пачынаючы аматар. Прапаноўваем увазе чытачоў два эцюды на асеннія матывы: «Ленінградская вуліца восенню» А. Лукашова і «Уніз па Свіслачы...» А. Гарэзнага.**

◆ ◆



**Многае змянілася ў інтэрнатах універсітэта з увядзеннем самаабслугоўвання. Яшчэ нядаўна, калі патрэбна было ўставіць у дзверы замок, кожны пакой у поўным складзе шукаў слесара. А зараз Георгій Філончык і сам выдатна спраўляецца з гэтай справай.**

**Фота А. ШРУБКА.**

## У ГАРНІЗОН ПРЫЕХАЛІ ШЭФЫ

Гэтая сустрэча надоўга застанецца ў памяці. Роўнымі радамі выстраены падраздзяленні марской авіяцыі, асенні вецер далёка разносіць гукі духавога аркестра. Так гарнізон сустракаў нашых спартсменаў.

Калі на горад апусціліся вячэрнія змрокі, вокны Дома афіцэраў засвяціліся агнямі. Прасторную залу запоўнілі матросы і старшыны, афіцэры і члены іх сямей. З цёплымі словамі прывітання да спартсменаў Беларускага універсітэта звярнулася камандаванне гарнізона, матросы—выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Уважліва слухалі сабраўшыяся расказ выкладчыка Л. М. Міхайлоўскага аб Беларускім універсітэце імя У. І. Леніна, перспектывах яго развіцця, аб вялікай навуковай рабоце, якая вядзецца на ўсіх яго кафедрах.

Студэнтка геафака Г. Лапо расказала аб жыцці і вучобе студэнтаў, аб навуковых студэнцкіх гуртках, спартыўным жыцці універсітэта.

З вялікай увагай сачылі гледачы за выступленнем нашых спартсменаў-гімнастаў Г. Рэзнікава, Н. Тумаковай, В. Іванова. Не засталіся ў даўгу і спартсмены-маракі: гледачы цёпла сустракалі кожны фізкультурны нумар.

Доўга яшчэ ў гэты вечар гарэлі агні ў Доме афіцэраў, танцавала моладзь.

На другі дзень зборная каманда універсітэта па валейболу правяла некалькі сустрэч са зборнай гарнізона і вайсковых падраздзяленняў. Ва ўсіх сустрэчах перамаглі нашы валейбалісты. За майстэрскую чоткую гульню камандаванне гарнізона ўзнагародзіла валейбалістаў універсітэта Граматай.

Калі заходзіш на кафедру фізвыхавання і спорту Белдзяржуніверсітэта, кідаецца ў вочы серабрысты макет рэактыўнага самалёта. Гэта падарунак вайсковай часці. Але самае галоўнае—гэта фотаальбом «Ваенныя маракі—Героі Савецкага Саюза», падараваны маракамі спартсменам нашага універсітэта. Гэта памяць аб цёплай сустрэчы студэнтаў і воінаў.

...І доўга звінелі ўслед ад'язджаючым нашым студэнтам універсітэта прыгожыя словы задушэўнай песні марскіх авіятараў.

...І поют, вспоминая родные места,
Закалённые службой пилоты.
Здесь всегда мы в строю
И готовы в бою
Постоять за Отчизну свою!

А. КАЗЯВІН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 10970. Зак. 1608. Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.